Абавязак святкаваць святы

Аўтар: кс. Максім Бачарнікаў паводле grodnensis.by
15.01.2017 00:00



Якія рэлігійныя святы абавязваюць верніка прымаць удзел у св. Імшы, а якія – не? Прысу тнічаць на літургіі кожнага каталіка абавязвае III запаведзь Дэкалогу **“Памятай дзень святы святкаваць”.**

Аб гэтым прыпамінаюць і касцёльныя запаведзі, у першай з якіх гаворыцца: **“У нядзелі і прадпісаныя святы ўдзельнічаць у св. Імшы і не рабіць неабавязковай працы”.**

Кожная дыяцэзія мае літургічны каляндар – дакумент, у якім узгадваюцца ўсе прадпісаныя святы, падчас якіх кожны пробашч абавязаны цэлебраваць св. Імшу ў сваёй парафіі. Звычайна ў календары адзначаны наступныя святы: **Святой Багародзіцы Марыі** (1 студзеня),
Аб’яўленне Пана або Трох Каралёў
(6 студзеня),
Пальмовая Нядзеля, Уваскрасенне Пана, Унебаўшэсце Пана, Найсвяцейшага Цела і Крыві Пана Езуса або Божае Цела, святых апосталаў Пятра і Паўла
(29 чэрвеня),
Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі
(15 жніўня),
Усіх Святых
(1 лістапада),
Беззаганнае Зачацце Найсвяцейшай Панны Марыі
(8 снежня),
Божае Нараджэнне
(25 снежня) і
ўсе нядзелі
.
†

Існуюць таксама святы, якія не з’яўляюцца прадпісанымі (напрыклад, Найсвяцейшай Панны Марыі – Маці Касцёла), аднак духавенства заахвочвае вернікаў, згодна са шматгадовай традыцыяй, прымаць удзел у св. Імшы ў гэты дзень. У некаторых краінах з дазволу Апостальскай Сталіцы пэўныя святы перанесены на нядзелю, каб працоўныя будні не заміналі жаданню верных прысутнічаць на літургіі.